да 5.7.1944 С. акупіравана ням.-фаш. захопнікамі. З 20.9.1944 у Маладзечанскай, з 20.1.1960 у Гродзенскай абласцях. У 1959 — 6,5 тыс. ж, у 1999 — 36,2 тыс. ж.

Архіт.-планіровачную структуру сучаснага горада вызначаюць вуліца Савецкая, Леніна, Я.Коласа, Юбілейная, Гагарына, Камінскага, Кутузава. Асн. кампазіцыйная вось — вул. Савецкая, забудаваная 2-5-9-павярховымі дамамі. Адм.-грамадскі і культ. цэнтр склаўся на вул. Савецкая і пл. Леніна, утворанай на скрыжаванні вуліц Савецкая і Гагарына. Сучасны горад развіваецца паводле генплана 1984 (карэкціроўка 2005). Забудоўваюцца Усх. і Зах. мікраараёны. Індывід. забудова сядзібнага тыпу ва ўсх., паўд., паўн. частках горада. У 2000-я гг. пабудаваны будынкі ЗАГСа, ААТ «ААБ Беларусбанк», аўтастанцыя, кафэ, магазіны. Рэканструяваны адм. быт. і прам. будынкі «Смаргоньміжрайгазу», вузла паштовай і электрасувязі, будынка «Аблдарбудаўніцтва», стадыёна ў цэнтр. парку. Устаноўлены помнік Ф.Багушэвічу (2009, скульпт. Л. і С.Гумілеўскія). Зона адпачынку — р. Вілія, Парк культуры і адпачынку.

У 2015 у С. гімназія, ліцэй, 6 сярэдніх школ, вучэбна-пед. комплекс дзіцячы сад—пачатковая школа, 8 устаноў дашкольнай адукацыі, цэнтры: карэкцыйна-развіваючага навучання і рэабілітацыі, сац.-пед., 3 ДЮСШ, раённы Цэнтр культуры, Цэнтр творчасці дзяцей і моладзі, 6 б-к, гісторыка-краязнаўчы музей; цэрквы: Іконы Божай Маці «У жальбах і смутках Суцяшэнне» (2000), Св. Пакутнікаў Віленскіх Антонія, Іаана і Яўстафія (2010), Праабражэнская (2009). Мемарыял памяці герояў і ахвяр Першай сусв. вайны. Брацкія магілы сав. воінаў, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну. Помнік Вызваліцелям. Помнік архітэктуры — кальвінскі збор (1553; цяпер Міхайлаўскі касцёл).



*Панарама цэнтра г.* ***Смаргонь.***

**СМАТРЫЦКІ** Мялецій (свецкае імя Максім Герасімавіч; 1577, г.п. Смотрыч Хмяльніцкай вобл., Украіна —27.12.1633), беларускі і ўкраінскі пісьменнік-палеміст, царк. дзеяч. Скончыў Віленскую езуіцкую акадэмію. Вучыўся ў Нюрнбергскім, Лейпцыгскім, Вітэнбергскім ун-тах, дзе атрымаў ступень д-ра медыцыны. З 1601 жыў у маёнтках кн. Б.Саламярэцкага на Магілёўшчыне, каля Мінска. У Вільні ўступіў у праваслаўнае брацтва пры Троіцкім манастыры. Выступаў супраць Брэсцкай уніі 1596. У 1608 супраць твораў І.Пацея выдаў «Антыграфі...». Аўтар кн. «Трэнас» (1610, на польск. мове), у якой заклікаў народ Беларусі і Украіны да аб'яднання супраць каталіцызму. У 1617 пастрыгся ў манахі пад імем Мялецій. Працаваў у брацкай школе Віленскага Святадухаўскага манастыра, быў рэктарам Кіеўскай брацкай школы (1618—20). Выдаў кн. «Грамматики словенския правильная синтагма...» (1619), у якой першым у гісторыі слав. мовазнаўства стварыў поўны, навукова сістэматызаваны курс граматыкі царк.-слав. мовы, выклаўшы яе 4 асн. часткі: арфаграфію, этымалогію, сінтаксіс, прасодыю. З 1620 архіепіскап полацкі, епіскап віцебскі і мсціслаўскі. Аўтар «Трактата аб паходжанні Святога Духа» (каля 1615), палемічных твораў «Апраўданне нявіннасці» і «Абарона апраўдання» (абодва 1621), «Дадатак да абароны апраўдання» (1622), «Выкрыванне з'едлівых твораў» (1622). У 1624—25 паломнічаў па святых мясцінах Блізкага Усходу (кн. «Апалогія падарожжа па ўсходніх землях», 1628). У 1627 тайна перайшоў на бок уніятаў. У творах «Пратэстацыя» (1628), «Паранэіс...» і «Экзатэіс» (абодва 1629) асудзіў праваслаўе і сваю ранейшую літ. дзейнасць на яго абарону. На старабел. мове напісаў прадмову да «Евангелля вучыцельнага» (1616) і «Казання.. на чэснае пахаванне... Лявонція Карповіча» (1620).

**СМОЛІК** Аляксандр Іванавіч (н. 24.10.1944, в. Каловічы Вілейскага р-на), беларускі культуролаг, гісторык. Д-р культуралогіі (2000), канд. гіст. навук (1972), праф. (1999). Скончыў Мінскі пед. ін-т (1968), працаваў у ім (у 1972—92 дэкан). З 1992 у Бел. ун-це культуры і мастацтваў (з 1992 прарэктар, з 2004 1-ы прарэктар, з 2006 заг. кафедры). Навук. працы па пытаннях тэорыі культуры, прыкладной культуралогіі, развіцця культу-

ры этнасаў і сацыядынамікі сучаснай бел. культуры. Аўтар кн. «Сацыядынаміка культуры ў посткатастрофным соцыуме» (1999), «Беларуская культуралогія: гісторыя і сучаснасць» (2014) і інш.

*Тв.*: Гісторыя і культура беларускіх татар. Мінск, 2000 (разам з І.Б.Канапацкім); Падрыхтоўка кадраў у Рэспубліцы Беларусь: сучасны стан і перспектывы. Мінск, 2001 (разам з Я.Д.Грыгаровіч, Л.М.Рагачовай); Прыкладная культуралогія. Мінск, 2005 (разам з Я.Д.Грыгаровіч); Божы дар Івана Кандрацьева. Мінск, 2013; Культура как образование: теоретико-прикладной анализ. Минск, 2015 (разам з Ю.П.Бондарам).

**СМО́ЛІЧ** Дзмітрый Мікалаевіч (11.4.1919, г. Санкт-Пецярбург — 28.4.1987), рэжысёр оперы. Засл. дзеяч мастацтваў Грузіі (1954). Засл. дзеяч мастацтваў Расіі (1958). Нар. артыст Украіны (1960). Нар. артыст Беларусі (1964). Нар. артыст СССР (1979). Скончыў оперна-драм. студыю імя К.Станіслаўскага ў Маскве (1941). Працаваў у розных оперных тэатрах. У 1962—69 гал. рэжысёр Дзярж. тэатра оперы і балета Беларусі. Спектаклі С. адметныя падпарадкаванасцю ўсіх элементаў агульнай маст. задуме, майстэрствам арганізацыі масавых сцэн. На бел. сцэне паставіў спектаклі: «Заручыны ў манастыры» С.Пракоф'ева, «Джаконда» А.Панк'елі, «Кето і Катэ» В.Далідзэ (усе 1962), «Атэла» Дж.Вердзі, «Арэстэя» С.Танеева (абодва 1963), «Севільскі цырульнік» Дж.Расіні, «Яснае світанне» А.Туранкова (абодва 1964), «Кастрычнік» В.Мурадэлі (1965), «Князь Ігар» А.Барадзіна, «Брэсцкая крэпасць» К.Малчанава, «Алеся» Я.Цікоцкага (усе 1967), «Багема» Дж.Пучыні, «Калі апалае лісце» Ю.Семянякі (абодва 1968), «Травіята» Дж.Вердзі (1969). Дзярж. прэмія Украіны 1971. Дзярж. прэмія Грузіі 1972.



*Д.М.Смоліч.*

**СМО́ЛЬСКІ** Дзмітрый Браніслававіч (н. 25.7.1937, Мінск), беларускі кампазітар, педагог. Засл. дзеяч мастацтваў Беларусі (1975). Нар. артыст Беларусі (1987). Скончыў Бел. кансерваторыю (1960). У 1962—2014 выкладаў у Бел. акадэміі музыкі (з 1986 праф.). Яго творчасці ўласцівы арыгінальнасць творчай задумы і яе высокамаст. ўвасабленне. Для стылю музыкі С. характэрны псіхалагізм, экспрэсіўнасць вобразаў, сіс-тэмнасць кампазіцыйных сродкаў. Сярод твораў: оперы «Сівая легенда» (паст. 1978), «Францыск Скарына» (паст. 1980), араторыі «Песні Хірасімы» (1966), «Мая Радзіма» (1970), «Паэт» (1980), вак.-сімф. цыкл «Бабін век» (1971), 13 сімфоній, канцэрты для фп., цымбал з сімф. аркестрам, канцэрціна для скрыпкі, віяланчэлі з аркестрам, 20 вак. цыклаў, інструм. пьесы, 2 струнных квартэты і інш. Прэмія Ленінскага камсамола Беларусі 1972. Дзярж. прэмія Беларусі 1980.



*Д.Б.Смольскі.*

**СНО́ЎСКІ ПАЛА́ЦАВА-ПАРКАВЫ КО́МПЛЕКС**, помнік палацава-паркавай архітэктуры ў в. Сноў Нясвіжскага р-на. Закладзены ў 1827 паводле праекта архіт. Б.Тычэц-

*Сноўскі палацава-паркавы комплекс.*

